Для павышэння ўзроўню культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў, дасягнення культуралогіяй адпаведнага статусу неабходна сур'ёзная работа па распрацоўцы навукова-метадычных дапаможнікаў з улікам профілю ВНУ, спецкурсаў, курсаў па выбары, адукацыйных модуляў. Важнай задачай з'яўляюцца распрацоўка, апрабацыя і ўкараненне сучасных тэхналогій навучання.

**М.А.Каралькоў**, *дацэнт*

## РОЛЯ АДУКАЦЫЙНЫХ СТАНДАРТАЎ У ФАРМІРАВАННІ ЭСТЭТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ

Эстэтыка з'яўляецца філасофскай навукай. Яе выкладанне абапіраецца на даволі строгую метадалогію і высокі ўзровень канцэптуальнасці, што не выключае даступнасці яе выкладання. Але эстэтыку нельга лічыць прыкладной дысцыплінай. Паколькі эстэтыка зарадзілася ў нетрах філасофіі, яна звязана з яе прынцыпамі, кіруецца яе метадамі ў вырашэнні спецыфічных задач.

Мэтамі эстэтычнай адукацыі з'яўляюцца:

— выпрацоўка правільнай каштоўнаснай арыентацыі ў кожнага студэнта;

— навучанне эстэтычнай аргументацыі, уменню абгрунтаваць уласную эстэтычную канцэпцыю;

— фарміраванне здольнасці эстэтычнага самааналізу, разумення асабістых матываў;

— выхаванне здольнасці разумення "эстэтычнага светапогляду" іншых людзей і ўмення ўступаць з імі ў спрэчку (дыскусію);

— фарміраванне пачуццёва-эмацыянальнай сферы, што ў сваю чаргу дае магчымасць замацаваць веды і перавесці іх ва ўпэўненасць;

— выпрацоўка ўмення разумець, даваць правільную ацэнку творам мастацтва;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— фарміраванне высокай эстэтычнай культуры студэнтаў.

Разглядаючы структуру і змест базавага курса эстэтыкі, неабходна паказаць месца эстэтыкі ў цыкле гуманітарных дысцыплін з мэтамі:

— акрэсліць кола з'яў, што вывучае дадзеная навука;

— паказаць сувязь эстэтыкі з іншымі гуманітарнымі дысцыплінамі;

— вызначыць метадалагічныя прынцыпы, на якія абапіраецца эстэтыка ў даследаванні праблем;

— паказаць практычнае значэнне адкрываемых гэтай навукай ісцін.

У структуру курса эстэтыкі ўключаны наступныя раздзелы:

1) эстэтыка як навука;
2) эстэтычная свядомасць і эстэтычная дзейнасць;
3) прырода і сутнасць мастацтва;
4) віды мастацтва;
5) сучасныя канцэпцыі ў эстэтыцы і мастацтве;
6) эстэтычная культура грамадства.

Кожны раздзел змяшчае шмат падраздзелаў або тэм, якія спрыяюць пабудове агульнай лініі эстэтыкі як навукі.

Для дакладнага высвятлення структуры і базавага курса эстэтыкі прапануем прыкладную праграму, якую неабходна засвоіць студэнтам вышэйшых навучальных устаноў.

*Прыкладная праграма курса "Эстэтыка"*

Эстэтыка — філасофская дысцыпліна, што вывучае агульныя заканамернасці развіцця эстэтычных адносін чалавека да рэчаіснасці, і асабліва мастацтва як спецыфічнай формы грамадскай свядомасці.

Разглядаючы тэму "Праблемы і задачы эстэтыкі" раздзела "Эстэтыка як навука", трэба паказаць, што прадмет эстэтычнага даследавання склаўся ў працэсе шматвяковага развіцця эстэтычнай думкі на падставе абагульнення практыкі эстэтычных адносін людзей да прадуктаў іх дзейнасці, твораў мастацтва, самога чалавека і інш. Прадметам даследавання эстэтыкі з'яўляюцца: 1) прырода

эстэтычнага, г.зн. найбольш агульныя характарыстыкі, якія належаць розным эстэтычным аб'ектам рэчаіснасці, напрыклад прыгожым, узнёслым, трагічным; 2) прырода адлюстравання гэтых з'яў у свядомасці чалавека, эстэтычных успрыманнях, уяўленнях, поглядах і тэорыях, ідэалах; 3) прырода эстэтычнай дзейнасці людзей як працэс стварэння эстэтычных каштоўнасцей. Неабходна паказаць значэнне эстэтыкі як тэарэтычнай асновы развіцця эстэтычнай культуры грамадства.

Пры вывучэнні тэмы "Галоўныя этапы развіцця эстэтычнай думкі" трэба звярнуць увагу на тое, што гісторыя эстэтыкі — гэта ўзнікненне і развіццё эстэтычных тэорый, барацьба матэрыялізму і ідэалізму, звязаная з вырашэннем галоўнага пытання эстэтыкі аб адносінах эстэтычнай свядомасці да рэчаіснасці. Неабходна прасачыць зараджэнне і развіццё эстэтычных тэорый у дзяржавах Старажытнага Усходу, Старажытнай Грэцыі (піфагарэйцы, Геракліт, Дэмакрыт, Сакрат, Платон, Арыстоцель, стоікі, эпікурэйцы, скептыкі і неаплатонікі), Старажытным Рыме (Лукрэцый, Гарацый),эстэтыцы сярэднявечча, асабліва заходнееўрапейскага (Аўгусцін, Баэцый, Фама Аквінскі і інш.), і эпохі Адраджэння (Альберці, Леанарда да Вінчы, А.Дзюрэр, Мантэнь, Эразм Ратэрдамскі). Трэба таксама спыніцца на барацьбе матэрыялістычнай эстэтыкі Адраджэння супраць ідэалістычных канцэпцый сярэднявечча. Неабходна разгледзець прынцыпы эстэтыкі класіцызму (Р.Дэкарт, М.Буало), нараджэнне і развіццё эстэтычных ідэй асветніцтва (Ф.Бэкан, Т.Гобс, Д.Лок, А.Шэфтсберы, Ф.Хатчысан, В.Хогарт, Э.Бёрк, Ф.Вальтэр, Д.Дзідро, Ж.Ж.Русо, І.Вінкельман, Г.Лесінг. І.Гердэр, Д.Форэстэр), эстэтычныя ідэі Ф.Шылера і І.Гётэ. Бясспрэчную цікавасць уяўляюць эстэтыка рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў (В.Бялінскі, М.Чарнышэўскі, А.Дабралюбаў), руская рэлігійная эстэтычная думка (М.Бярдзяеў, Л.Шэстаў, У.Салаўёў) і нямецкая класічная эстэтыка, прадстаўленая І.Кантам, Г.Гегелем і інш. Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на гісторыю ўзнікнення і развіцця беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эстэтычнай думкі. Завяршыць выкладанне тэмы трэба эстэтычнымі вучэннямі XX ст., неабходна даць крытычную ацэнку розным школам, накірункам сусветнай эстэтычнай думкі.

Пры вывучэнні раздзела "Эстэтычная свядомасць і эстэтычная дзейнасць" трэба вызначыць наступныя тэмы: 1) праходжанне эстэтычных свядомасці і дзейнасці; 2) структура эстэтычнай свядомасці; 3) эстэтычная дзейнасць і яе віды; 4) эстэтычныя з'явы і асноўныя катэгорыі эстэтыкі.

У першую чаргу неабходна разгледзець прычыны ўзнікнення эстэтычных свядомасці і дзейнасці, раскрыць іх спецыфіку. Гэта звязана з тым, што аб эстэтычных каштоўнасцях можна гаварыць, толькі суадносячы іх з эстэтычнымі дзейнасцю і свядомасцю.

Грамадская свядомасць выступае як адлюстраванне грамадскага быцця ў пачуццях, поглядах і тэорыях. Разуменне прычын фарміравання эстэтычных светапогляду, патрабаванняў, інтарэсаў дазваляе растлумачыць узнікненне эстэтычных адносін да рэчаіснасці, пераканаўча давесці, што ў аснове ўзнікнення іх знаходзіцца практычная дзейнасць.

Свядомае афармленне прадметаў узнікае таму, што ў працэсе вытворчай дзейнасці з'яўляюцца новыя, уласцівыя толькі чалавеку эстэтычныя пачуцці, якія дазваляюць не проста бачыць рэчы, а і ў працэсе ўспрымання адрозніваць прыгожае ад непрыгожага, адчуваць прыгажосць, захапляцца. У чалавека сфарміравалася "вока, што адчувае прыгажосць формы" (К.Маркс).

Значнае месца ў жыцці людзей займае мастацтва. Мастацкая дзейнасць не толькі адкрывае твор мастацтва для суб'екта, але і рыхтуе чалавека да ўспрымання твора.

Разуменне прычын узнікнення і развіцця эстэтычных свядомасці і дзейнасці дае магчымасць раскрыць спецыфіку эстэтычнай свядомасці. Разглядаючы структуру апошняй, трэба вылучыць наступныя пытанні: 1) эстэтычныя ўспрыманне і пачуццё; 2) эстэтычныя густы, меркаванні, ідэалы, погляды і тэорыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гаворачы аб эстэтычных успрыманні і пачуцці, неабходна падкрэсліць: грамадская свядомасць існуе ў розных формах, мае розныя ўзроўні. Эстэтычная свядомасць — адна з формаў грамадскай свядомасці, якая адлюстроўвае з'явы рэчаіснасці ў эстэтычных пачуццях і ўяўленнях, густах і ідэалах, поглядах і тэорыях. Эстэтычныя пачуцці, уяўленні, густы, ідэалы і погляды ўваходзяць у звычайную свядомасць людзей, эстэтычныя тэорыі адносяцца да навуковага светапогляду, да ідэалогіі. Раскрываючы структуру эстэтычнай свядомасці, неабходна зыходзіць з тэорыі адлюстравання.

Пры вывучэнні эстэтычнай дзейнасці і яе відаў трэба звярнуць увагу на такія пытанні, як паняцце і асноўныя віды эстэтычнай дзейнасці; працэс мастацкай творчасці.

Раскрываючы змест гэтых пытанняў, трэба ўлічваць: любы чалавек у сучасным грамадстве мае высокі ўзровень эстэтычнай свядомасці, здольны да эстэтычнай ацэнкі з'яў рэчаіснасці, г.зн. характарызуецца эстэтычным густам. Іншая справа — узровень развіцця эстэтычных густаў і ідэалаў. У адпаведнасці з тым, на што накіравана эстэтычная дзейнасць і што з'яўляецца яе прадметам, вызначаюць наступныя віды яе: эстэтычнае пераўтварэнне навакольнага асяроддзя; фарміраванне прыгожага чалавека; мастацкая творчасць; эстэтычная дзейнасць у сферы вытворчасці. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на мастацкае канструяванне — дызайн. Разам з ім развіваюцца розныя віды мастацкай прыкладной дзейнасці.

Эстэтыка стварае агульную тэорыю мастацкай творчасці, у якую ўваходзіць вучэнне аб мастаку як творцы, суб'ектыўных і аб'ектыўных перадумовах мастацкай творчасці, светапоглядзе і светаадчуванні мастака, метадзе творчасці, месцы мастака ў грамадстве і інш.

Увагі заслугоўвае вывучэнне асноўных эстэтычных катэгорый. Эстэтычныя катэгорыі — ядро эстэтычнай навукі. У іх адлюстроўваюцца вузлавыя моманты эстэтычнага пазнання, спецыфічныя асаблівасці і сувязі аб'ектыўнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свету, своеасаблівасць эстэтычных катэгорый. Найбольш агульнай, усёабдымнай катэгорыяй з'яўляецца эстэтычнае. Таму разгляд эстэтычных катэгорый трэба пачынаць з катэгорыі эстэтычнага, дзеля таго каб потым перайсці да катэгарыяльнага вызначэння эстэтычных адносін: прыгожага, узнёслага, трагічнага, камічнага, брыдкага, ганебнага. Важна раскрыць прыроду і філасофскую сутнасць вышэйназваных катэгорый праз дыялектычнае ўзаемадзеянне аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, рэальнага і ідэальнага, агульнага і асобнага, рацыянальнага і эмацыянальнага.

Разглядаючы прыгожае, трэба падрабязна спыніцца на такіх законах прыгажосці, як гармонія, цэласнасць, мера, мэтанакіраванасць і іншыя, паказаць шматстайнасць формаў выяўлення прыгажосці ў прыродзе, грамадстве, працы, звярнуць увагу на брыдкае як процілегласць прыгожаму, пакрытыкаваць эстэтызацыю брыдкага ў сучасных мастацтве, эстэтыцы.

Характарызуючы катэгорыю ўзнёслага, неабходна паказаць не толькі адрозненне паміж прыгожым і ўзнёслым, але і агульнае, што іх аб'ядноўвае. Асобна трэба спыніцца на ўзнёслым у прыродзе, грамадстве, мастацтве, асабістым жыцці людзей. Узнёслае звязана з гераічным, трагічным. У якасці антыпода ўзнёсламу выступае ганебнае.

Значнае месца ў эстэтыцы займае праблема трагічнага. Неабходна засяродзіць увагу на тым, што разуменне трагічнага, а таксама іншых эстэтычных катэгорый на працягу гісторыі змянялася. Супярэчлівыя ацэнкі даваліся не толькі матэрыялістамі і ідэалістамі. Часта супярэчнасці ўзнікалі ўнутры канцэпцыі. Варта раскрываць сацыяльную прыроду трагічнага, асаблівасці трагічных калізій сучаснай эпохі, сутнасць эстэтычнага, маральна-выхаваўчага ўздзеяння трагічнага. Асобна трэба спыніцца на праблеме трагічнага ў мастацтве.

Канфлікт паміж рэальным і ідэальным вядзе не толькі да паражэння або смерці носьбіта ідэальнага. Часта ідэальнае

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўступае ў канфлікт з рэальным, высмейвае яго, а гэта ўжо камічнае. Існуюць розныя формы камічнага: жарт, сатыра, іронія, гратэск, фарс і інш. Мера неадпаведнасці рэальнага ідэалу выклікае адпаведную форму камічнага. Неабходна паказаць аблічча камічнага і смешнага, раскрыць мастацкія сродкі камедыі ў розных відах мастацтва.

Нарэшце, трэба ўказаць на дыялектычную ўзаемасувязь эстэтычных катэгорый.

Вывучаючы раздзел "Прырода і сутнасць мастацтва", трэба мець на ўвазе, што веданне тэорыі мастацтва дазваляе глыбей успрымаць і разумець мастацкія творы, ацэньваць іх, садзейнічаць развіццю мастацтва. Апошняе ўключае велізарную колькасць твораў розных відаў (архітэктура, жывапіс, скульптура, графіка, літаратура, музыка, танец, тэатр), гістарычных эпох (антычнае мастацтва, мастацтва сярэднявечча, Адраджэння) і накірункаў (класіцызм, рамантызм, рэалізм ) і інш.

Уласцівасці відаў мастацтва і іх гістарычнае развіццё вывучае мастацтвазнаўства. Эстэтыка, абагульняючы веды, атрыманыя мастацтвазнаўчымі навукамі, дае тлумачэнне законаў развіцця мастацтва. Разуменне прыроды мастацтва прадугледжвае высвятленне пытанняў асноўных уласцівасцей мастацтва, зместу і форме ў мастацтве.

Разглядаючы тэму "Эстэтычнае ўспрыманне і ацэнка твораў мастацтва", важна вылучыць такія пытанні, як працэс успрымання і ацэнка твораў мастацтва.

У тэме "Мастацтва як грамадская з'ява" неабходна падрабязна разгледзець наступныя пытанні: уплыў грамадства на мастацтва; уздзеянне мастацтва на грамадства.

Веданне прычын і законаў гэтага ўздзеяння вынікае з разумення сувязі мастацтва і грамадства, якое дазваляе раскрыць сацыяльныя функцыі мастацтва, яго ролю ў выхаванні. У сувязі з гэтым трэба спыніцца на функцыях мастацтва: камунікатыўнай, адукацыйнай, ідэйна-выхаваўчай, эстэтычнай, культуралагічнай, творчай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разуменне функцый мастацтва, яго ролі ў жыцці грамадства дазваляе пераканацца ў тым, што яно садзейнічае фарміраванню ўсебакова развітай, гарманічнай асобы.

Даследаванне ўзаемасувязі мастацтва і грамадства дае магчымасць прасачыць заканамернасці яго гістарычнага развіцця, растлумачыць яго прагрэсіўны характар. Таму важнай задачай уяўляецца разгляд такіх пытанняў, як метад мастацкай творчасці, накірунак і стыль у мастацтве; асноўныя законы развіцця мастацтва; адносная самастойнасць яго развіцця.

Звяртаючыся да раздзела "Віды мастацтва", неабходна вылучыць наступныя тэмы: 1) класіфікацыя мастацтва і сістэма яго відаў; 2) дэкаратыўна-прыкладное мастацтва; 3) архітэктура; 4) жывапіс; 5) графіка; 6) скульптура; 7) літаратура; 8) музыка; 9) танец; 10) тэатр; 11) кіно і тэлебачанне.

Трэба мець на ўвазе: агульныя ўласцівасці мастацтва па-рознаму выяўляюцца ў шматлікіх групах твораў, што складаюць яго віды. Гэта з'яўляецца падставай відавой класіфікацыі мастацтва.

Мастацкія творы выяўляюць духоўны свет людзей, іх эстэтычныя ўражанні, ідэалы дзякуючы адлюстраванню розных бакоў навакольнай рэчаіснасці. Мастацкія творы падзяляюцца паводле спецыфікі выразнага адлюстравання, па тым, які бок рэальнасці адлюстроўваецца ў выглядзе мастацкіх вобразаў, а таксама па матэрыяле, з якога створаны, дзякуючы якому існуюць творы.

Аб'ектам адлюстравання мастацтва з'яўляецца жыццё чалавека, грамадства ў розных праявах. Колер, аб'ём, гук, рух, мова людзей, іх дзейнасць і ўчынкі, пачуцці, адлюстраваныя ў творах мастацтва, выступаюць асновай вызначэння віду мастацтва.

У раздзеле "Сучасныя канцэпцыі ў эстэтыцы і мастацтве" патрэбна вызначыць наступныя тэмы: 1) анталагічныя канцэпцыі: неатамізм, хрысціянскі экзістэнцыялізм; 2) інтуітывісцкая эстэтыка: бергсаніянскія, крочэанскія,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неаінтуітывісцкія канцэпцыі; 3) ірацыяналісцка-антрапалагічныя канцэпцыі: фрэйдызм і неафрэйдызм; 4) неапазітывізм у эстэтыцы; 5) прагматычная эстэтыка; 6) пазітывісцкая эстэтыка; 7) элітарныя і масавыя канцэпцыі мастацтва.

Раздзел "Эстэтычная культура грамадства" разглядае сукупнасць эстэтычных поглядаў і густаў, праяў эстэтычнай дзейнасці. з'яў мастацкага жыцця, формаў, спосабаў засваення эстэтычных каштоўнасцей, што складае эстэтычную культуру грамадства.

У задачы эстэтыкі ўваходзяць вызначэнне і вывучэнне законаў развіцця эстэтычнай культуры, яе сутнасці, ролі ў сацыяльным жыцці. Неабходна разгледзець шляхі пераходу ад традыцыйнай культуры развітага буржуазнага грамадства да пачатку новага, пераходнага этапу ў гісторыі культуры. а таксама праблемы постмадэрнізму. Важнейшым момантам, на якім трэба засяродзіць увагу, з'яўляецца фарміраванне эстэтычнай культуры грамадства.

**А.Л.Карацееў**, *дацэнт*

## РОЛЯ ПРАГРЭСІЎНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДУХАВОГА МАСТАЦТВА Ў ПРАЦЭСЕ РАСПРАЦОЎКІ СУЧАСНЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ СТАНДАРТАЎ

Поспехі сучаснага музычнага мастацтва патрабуюць падрыхтоўкі спецыялістаў, здольнай забяспечыць яго развіццё. Пэўныя праблемы існуюць у сферы духавога выканання. Узнікае неабходнасць вызначэння параметраў, што складуць аптымальную мадэль, з'явяцца стандартам падрыхтоўкі спецыялістаў гэтай галіны. Вывучэнне гісторыі фарміравання, развіцця сусветнага і нацыянальнага духавога мастацтва дазваляе вылучыць асноўныя тэндэнцыі адукацыйнага працэсу:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ